


## ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ, альбо Старэйшых і ў турме шануюць

...Некалі раней усе навіны мясцовага значэння вясковыя жанчыны (пра мужчын размова асобная) абмяркоўвалі «на сяле» альбо каля студні, прыходзячы па ваду... Цяпер ужо іншае месца збору: пляцоўка, дзе спыняюцца аўтапошта і аўтакрама. У чаканні іх (ды ў добрае надвор'е!) чаго толькі не пачуеш! Тэмы — самыя розныя: цэны, дзеці і ўнукі, кінафільмы, дарагія ўспаміны і, вядома ж, хатнія гадаванцы. Сцяпанаўна, жанчына «залатога ўзросту», неяк раз пахвалілася, што кацяня ўзяла.

— Дык ты ж як быццам не збіралася? — здзівілася яе аднагодка.

— Не... Аднак перадумала: жыццё прымусіла. Гэта ж пад Новы год мы з мужам ёлачку дома паставілі. Цацак шмат — было чым упрыгожыць! А да ўсяго я цукерак накупляла — дарагіх, у бліскучых абгортках... Як у дзяцінстве на галінкі навешала... Атрымалася вельмі прыгожа!

Але ж праз дзень-другі гляджу — і ўжо як быццам не так, быццам меней «цацак» на ёлцы. Ну, думаю, не я адна — і гаспадар мой маленства ўспомніў, душу адвёў... Пасмяялася ды змаўчала — няхай чалавек пацешыцца — свята ж, Каляды...

Але ён, бачу, ну ніяк не спыніцца: ёлка ўсё болей «лысее», цукерак — лічы што няма...

Я з той крыўды адчыніла старую шафу, думала супакоіцца — рэчы там перабраць. Пацягнула да сябе ніжнюю шуфляду і вачам не паверыла: у куточку цэлы «стог» бліскучых абгортак! Тут, што называецца, да бабкі не хадзі: мышы «балявалі» — ладзілі сабе салодкі стол.

Клічу свайго чалавека, паказваю знаходку. «Во, — кажу, — а я ж на цябе грашыла! І нават злавала!» — «А я — на цябе», — кажа мой.

Во як бывае!

Разам з ім пасмяяліся, памірыліся — разам надумалі коціка ўзяць.

— А мы ж некалі наадварот, — стала ўспамінаць Міронаўна, — збыць хацелі... Маладыя былі: толькі пажаніўшыся, у мамы сталі жыць. І быў там кот. Яго «старым дармаедам» звалі, бо мышы па хаце шастаюць, а ён толькі спіць... Мама да зяця (мой шафёрам працаваў): «Звязі ты яго! Маладзенькага возьмем».

Зяць спярша — ні ў якую: нават слухаць не хацеў, але ж гэта цешча, гаспадыня, ды і я ёй стала «падпяваць»... Так што ўрэшце муж згадзіўся: сказаў, што павязе на мясакамбінат калгасную жывёлу, а заадно — і ката... Там, маўляў, шмат такіх... Не прападзе.

Як сказаў, так і зрабіў: зранку, на развітанне, смачна пакарміў, потым завёз (за 80 вёрстаў!), на тэрыторыі камбіната выпусціў — пайшоў дакументы выпісваць.

Дамоў вярнуўся толькі пад вечар. Падышоў да хаты, — на ганку наш дармаед сядзіць! Не ўпадабаў, значыць, новае месца, заскочыў (мы так падумалі) на запаснае кола (там мешкавіна ляжала, каб, перавозячы, збожжа накрываць) і вось так вярнуўся дамоў.

Пасля гэтага нават мама праслязілася, зашкадавала ката, не звала больш гультаём-дармаедам. Старых, казала, і ў турме шануюць.

Мела рацыю.

**Іван Букоўскі,**
*Глыбоцкі раён.*


Валянцін Губараў. «Жыццё цудоўнае!»

## ЗА СПАКОЙ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ, альбо Паўдня з жыцця жанчыны

Эмілія — «пані трошкі ў гадах», разумная, дзелавая, рухавая... Яна хіба гэту вясну сустрэла неяк не так: больш разбітай — і фізічна, і маральна.

— Не падабаецца мне твой настрой, — заключыла суседка (медык па адукацыі). — Ты калі шчытавідку сваю правярала? Ці забылася, што ў цябе з ёй праблемы?

Так, праблемы і былі, і ёсць: як паказала ўльтрагукавое даследаванне, залоза павялічылася, вузельчыкі таксама... А больш поўнае даследаванне, жанчыне сказалі, можна зрабіць у абласным дыягнастычным цэнтры.

Накіраванне туды Эмілія разгарнула ўжо дома, прачытала яшчэ і тое, што пераблытаныя яе імя, імя па-бацьку. Значыць, у паліклініку прыйшлося паехаць яшчэ раз. І гэта быў толькі пачатак.

...Білет на аўтобус яна брала загадзя, сумку складвала напярэдадні вечарам. Раніцай паглядзела, ці ўсё ўзяла?

Кашалька на месцы не аказалася. «Вось жа безгаловая, — падакарала сама сябе, — забылася пакласці».

Кашалёк знайшоўся не адразу, бо ляжаў... у прыбудове да хаты, у веласіпеднай карзінцы (напярэдадні Эмілія ездзіла ў краму па прадукты).

На гэтым зборы завяршыліся, як і час на іх: каб даехаць да аўтавакзала, трэба было выклікаць таксі.

Жанчына спехам набрала нумар — ёй прапанавалі... гульню; у «Вайберы» націснула квадрацік «Таксі «Калі ласка». Там чамусьці двойчы перапыталі адрас, пасля чаго ветлівa патлумачылі, што гэтая служба ў... іншым горадзе.

А гадзіннік між тым цікаць не перастаў, верагоднасць спазніцца на прыём імкліва расла. У роспачы Эмілія набрала трэці нумар — кругласутачнага таксі. Мужчына (праўда, заспаны) прыняў заказ, сказаў, што машына выязджае.

Абнадзееная пасажырка тут жа замкнула дзверы дома, выйшла сустракаць, а на вуліцы між тым «33 няшчасці»: лівень, цемра, вецер такі, што вырывае з рук парасон...

У далечы, на шчасце, замільгала святло аўтамабільных фар. «Паспею!» — падумала жанчына. Аднак тое святло чамусьці... спынілася — застыла на месцы.

Іншага выйсця не было: Эмілія — па гразі — пабегла да машыны, і — ура! — у пункце А пасажырка і таксі сустрэліся! Кіроўца прызнаўся, што пераблытаў нумар дома.

...У аўтобус жанчына заскочыла за хвіліну да яго адпраўлення. Але на гэтым яе прыгоды не завяршыліся. На пад'ездзе да Полацка вадзіцель аб'явіў пасажырам, што ім давядзецца перасесці: гэты аўтобус, маўляў, няспраўны.

Карацей, у дыягнастычны цэнтр Эмілія зноў імчала на таксі. Там, пад дзвярыма патрэбнага кабінета, ёй трэба было паразумецца з чаргой, у самім кабінеце — зарэгістравацца, дачакацца выкліку.

Але ж добра ўсё, што добра заканчваецца. Вынікі абследавання паказалі, што ў жыцці жанчыны гэта вясна, дасць бог, не апошняя!

...«Усе знакі супраць былі, — выслухаўшы пералік прыгод і непрыемнасцяў, заўважыла потым суседка-медык. — Можа, табе і не трэ было ехаць?»

Эмілія не згадзілася: сказала, што за спакой усё ж лепш заплаціць. Хай сабе і нервамі.

**Фаіна Касаткіна,**
*г. Паставы.*

## ГЭТА БЫЎ НЕ МУЛ... Тады хто?

Не толькі жанчын, — і мужчын таксама часам хлебам не кармі, дай расказаць нейкую гісторыю! Вось гэту я ў лазні пачуў:

— У 70-я гады мінулага стагоддзя, — здалёку пачаў знаёмец, — у нашы мясціны завезлі мулаў: прыгожых шэрых жывёлін з вялікімі такімі рагамі...

(Апошнія два словы і мяне, і «публіку» насцярожылі, бо ўсе, як выглядала, ведалі, што мулы — гэта помесь кабылы з аслом, таму ў іх аніякіх рагоў няма і нават быць не можа — па вызначэнні, як моладзь кажа. Але ж людзі маўчаць, і я маўчу — не перапыняю: слухаем, што будзе далей.)

А чалавек і расказвае, што мулаў прывезлі ды выпусцілі ў лес, каб яны там спакойна пасвіліся, спакойна... размнажаліся.

(І на гэты раз хіба хто ўсміхнуся, бо вядома ж, што мулы самі па сабе патомства не даюць — іх спецыяльна разводзяць для розных гаспадарчых работ.

Але ж, як той казаў, не люба — не слухай, а брахаць — не перашкаджай.

Іншыя мужчыны рабілі тое ж: гэта значыць, стрымана ўсміхаліся ды чакалі працягу).

І дзядзька іх не падводзіў: расказваў, што неяк раз адзін з нашых месцічаў пайшоў на паляванне і яму вельмі пашчасціла — падстрэліў мула.

Там жа, у лесе, на месцы, разабраў яго, мяса спакаваў у заплечнік, рогі прымацаваў зверху і рушыў дамоў.

На гэтым, праўда, шанцаванне завяршылася, бо на паляўнічага наляцеў нарад міліцыі і адразу ж (што важна — па рагах!) здагадаўся, што застрэлены мул, а паколькі гэтая жывёліна занесена ў Чырвоную кнігу, то ўляпілі мужыку столькі штрафу...

Тут адзін са слухачоў ужо не вытрываў — сказаў: «Ну што ты пляцеш? Якая Чырвоная кніга? Якія рогі ў мула?! Ад каго яны? Ад кабылы ці ад асла? Ты іх калінебудзь з рагамі бачыў?»

«Не, — кажа той чалавек, трохі разгубіўшыся... І тут жа да «крыўдзіцеля»: «Ну чаго ты да мяне прычапіўся? Можа, гэта і не мул быў? Бо дакладна — з рагамі... Можа, я проста назву зблытаў? Так-такі: гэта быў не мул! Му... Му... Муфлон, здаецца?!»

Сцены лазні аж скалануліся ад рогату! Смех з паўгадзіны не сціхаў! Ды і потым — успомніш муфлона (з вялікімі прыгожымі рагамі) і ўсміхнешся, падумаеш: «А не хадзілі б мы ў лес са стрэльбамі, не палявалі на жывёл, можа, яны б і размнажаліся?»

**Ігар Солтан,**
г. п. Івянец.

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж** *на гэты раз — цытата з ліста: «...Мяне даўно зацікавіла рубрыка «Чалавек на провадзе» (згадзіцеся, цікавае «прачытанне» назвы?). І я таксама вельмі хацеў бы падзяліцца з людзьмі сваёй гісторыяй. Але ж ці надрукуе яе газета?»*

*Каб адказаць на гэтае пытанне, гісторыю — згадзіцеся — трэба прачытаць.*

*А таму — пішыце, дасылайце (пажадана — з нумарам тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі): «звяздоўскі» конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую — працягваецца, журы працуе.*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кітай заклікаў ЗША спыніць узбройваць Тайвань



Вашынгтон павінен прадэманстраваць, што не падтрымлівае сепаратысцкія сілы на Тайвані, і спыніць пастаўляць узбраенні востраву. Пра гэта на брыфінгу заявіла прадстаўнік канцылярыі Дзяржсавета КНР па справах Тайваня Чжу Фэнлянь, каментуючы адабрэнне Сенатам Кангрэса ЗША законапраекта аб ваеннай дапамозе Тайваню, паведаміла ТАСС. Яна адзначыла, што законапраект сур'ёзна парушае прынцып «аднаго Кітая», палажэнні трох сумесных камюніке Кітая і ЗША і пасылае няправільны сігнал сепаратысцкім сілам, якія выступаюць за незалежнасць Тайваня. «Мы рашуча выступаем супраць», — заявіла Чжу Фэнлянь. Тайваньскае пытанне з'яўляецца выключна ўнутранай справай Кітая і не церпіць ніякага знешняга ўмяшання, падкрэсліла яна. Паводле яе слоў, большасць жыхароў Тайваня хочуць міру, развіцця, абменаў і супрацоўніцтва, а не вайны, рэцэсіі, падзелу і канфрантацыі. Чжу Фэнлянь заўважыла, што кіруючая тайваньская партыя «ігнаруе грамадскую думку, гатова стаць пешкай знешніх сіл для стрымлівання Кітая». Прадстаўнік канцылярыі падкрэсліла, што любыя спробы сепаратыстаў сілай або з апорай на знешнія сілы дасягнуць незалежнасці асуджаныя на правал. Раней Сенат Кангрэса ЗША адобрыў пакет законапраектаў аб аказанні ваеннай дапамогі Украіне, Ізраілю і Тайваню, канфіскацыі замарожаных актываў Расіі фактычна для іх перадачы Кіеву, а таксама ўвядзенні дадатковых санкцый у дачыненні да Кітая.

## Замаразкі пагражаюць еўрапейскім фермерам вялізнымі стратамі



З сярэдзіны красавіка большую частку Еўропы накрыла хваля арктычнага холаду пасля некалькіх тыдняў заўчаснай спякоты. Асаблівую небяспеку замаразкі прадстаўляюць для вінаградарства, пакутуюць і іншыя фруктовыя гаспадаркі, паведаміў Euronews. І хоць да канца месяца намячаецца пацяпленне, фермеры ў многіх краінах Балканскага рэгіёна апасаюцца, што не збяруць ураджаю. У Нідэрландах сумётаў не было, але пасадкам пагражаюць нізкія тэмпературы. Фермеры апырскваюць пладовыя дрэвы вадой, каб ледзяная скарыначка не дала будучым пладам змерзнуць. Нязручнасці з-за пахаладання адчуваюць не толькі фермеры. У высакагорных раёнах Аўстрыі снегам замяло дарогі, пры гэтым многія аўтамабілісты перайшлі ўжо на летнія шыны. Паводле прагнозаў, экстрэмальныя ўмовы надвор'я захаваюцца да наступнага тыдня.

## У Парыжы абрынуліся млынавыя крылы кабарэ «Мулен Руж»




Крылы ўпалі на праезную частку паміж двума-трыма гадзінамі ночы (3.00—4.00 па мінскім часе), паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал BFMTV. У выніку здарэння пашкоджанне атрымала шыльда ўстановы, з яе ўпалі першыя тры літары. У «Мулен Руж» заявілі, што сімвал кабарэ ўпаў, верагодна, па тэхнічных прычынах. Пажарныя і паліцыя прыбылі на месца здарэння, пацярпелых няма. Кабарэ «Мулен Руж» — адна са славутасцяў французскай сталіцы. Яно ўпершыню адчыніла свае дзверы 6 кастрычніка 1889 года. Будынак установы размешчаны каля падножжа Манмартра. Ён уяўляе сабой млын, што адлюстравана ў самой назве ўстановы, якая ў перакладзе азначае «Чырвоны млын».